**Пашэвіч, В.** Абаронца / В. Пашэвіч // Родныя вытокі. — 2005. — 12 лют. — С. 2.

# АБАРОНЦА



«Душман!» – аклікнуў знаёмага вясковец. Гукнуў па-сяброўску, без злосці ці насмешкі. А ў таго, каго датычыў зварот, сціснуліся кулакі і выраз вачэй змяніўся.

Гэта – быццам лязом па венах, быццам соллю па крыватачывай ране. Слова, якое выклікае балючыя ўспаміны, слова вайны. «Душман» – значыць, вораг. Кідацца ім бяздумна – злачынства.

– Калі Віктар пасля вяртання з Афганістана, дзе ў 1986–1988 гадах праходзіў армейскую службу, чуў у свой адрас «душман», ён гатовы быў біцца. Яно вельмі крыўдзіла сына, закранала за жывое, – расказвае 74-гадовая Феліцыя Адольфаўна Ляпёшка з Гінчанцаў Тумілавіцкага сельсавета.

Віктар Аляксандравіч Ляпёшка (на здымку) да арміі закончыў Докшыцкую аўташколу. Хлопцаў-дапрызыўнікоў там вучылі кіраваць вялікімі трохмастовымі КамАЗамі. Падрыхтоўка была належнай, прайшоўшы яе, курсанты ўмелі і добра ездзіць, і, калі спатрэбіцца, рамантаваць сваю тэхніку.

Віктар, як і ўсе іншыя, быў падрыхтаваны да службы ва Узброеных Сілах. Калі праходжаннем вучэбкі стаў Таджкістан, далейшае для салдата намалявалася канкрэтна і беспамылкова. Афганістан.

Шынданд, Герат – прыкладна 150 кіламетраў да нашай Кушкі. Даволі блізка, але ў той час нашым ваеннаслужачым гэта здавалася далечынёй. Таму што за Кушкай было сваё, бяспечнае, ціхае і мірнае жыццё, а тут – вайна.

– Мы ездзілі ў калоне, вазілі боепрыпасы, муку, іншыя неабходныя грузы. Пад абстрэл не траплялі. Але кожная паездка была звязана з рызыкай. Трэба было ўсіх, нават маленькіх афганцаў, на ўсялякі выпадак апасацца. Хаця інцыдэнтаў з мясцовым насельніцтвам у нас не здаралася. Наш батальён размяшчаўся ля Шынданда, блізка былі кішлакі. З маджахедамі даводзілася сустракацца ў мірным становішчы, гутарыць. На дзіва, многія з іх добра разумелі рускую мову, – узгадвае былы воін-афганец.

Часта здараліся камандзіроўкі ў Кандагар. Нягледзячы на тое, што гэты горад значна далей ад мяжы, усё ж жыццё там адрознівалася ад таго, якім яно было ў кішлаках. Жанчыны там па

вуліцы хадзілі з непакрытымі тварамі. А ў кішлаках, па словах Віктара, за час службы так і не ўдалося ўбачыць ніводную жанчыну. Такое адчуванне складвалася, што нават у паранджы ці чадры ім не дазвалялася пакідаць дамашнія сцены.

Сярод уражанняў, якія засталіся ў памяці, – штодзённыя шматлікія малітвы мусульман. На дворыках падсцілалі пад калені маленькія дыванкі і, апускаючыся на іх, аддана лбамі дакраналіся да зямлі, чытаючы ўголас каран. Збіраліся ж толькі мужчыны.

– На харчаванне скардзіцца не даводзілася. Часта давалі беларускую, дакладней, глыбоцкую згушчонку. Рэгулярнай была на стале тушонка. Вось толькі па бульбе сумавалі – даваць яе давалі, але сушанаю, нясмачную – расказвае былы воін-інтэрнацыяналіст.

Лісты з Радзімы атрымліваў без затрымак – ад бацькоў, сваякоў. Але ўсё роўна сумаваў. Маці Віктара памятае і сёння:

– Казаў, што для яго галоўным было, каб у дарозе не падвяла машына, за тэхнічным станам якой сам сачыў. А калі перад самай дэмабілізацыяй затрымаўся доўгачаканы самалёт, сын у адчаі напісаў дадому: «Я, мусіць, ужо не вярнуся». Прачытаўшы, мы з бацькам аслупянелі. Але ён прыехаў. Як толькі зрабіў крок на родны двор, паваліўся на зямлю і стаў яе цалаваць. Ужо потым мы ўбачылі, што падэшвы яго ног чырвоныя, і скуры на іх няма. Лячылі, прывозілі з Мінску мазь. Выхадзілі.

...Сёння партрэт Віктара Аляксандравіча Ляпёшкі можна ўбачыць на Дошцы гонару сярод лепшых работнікаў Тумілавіцкага лясніцтва. На сваім участку ў 900 га, што ля возера Мяжужала, майструе шпакоўні, абгароджвае мурашнікі. Любіць і абараняць усё жывое – спрадвечнае правіла гэтага чалавека.

**В. Пашэвіч**